УДК 339.5

# ПРАБЛЕМЫ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНАЙ БЯСПЕКІ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

А. П. Пятроў-Рудакоўскі, БелДУТ, Гомель
E-mail: antonaap@tut.by

*Адкрытая эканоміка Беларусі ў сістэме міжнародных эканамічных адносінаў атрымлівае і выгоды, і рызыкі.*

*Ключавыя словы: знешнеэканамічная бяспека, экспарт, імпарт, дыверсіфікацыя, канкурэнтаздольнасць, залежнасць, знешняя палітыка.*

# PROBLEMS OF ENSURING FOREIGN ECONOMIC SECURITY IN MODERN CONDITIONS

*The open economy of Belarus in the system of international economic relations receives both benefits and risks.*

*Keywords: foreign economic security, export, import, diversification, competitiveness, dependence, foreign policy.*

Ва ўмовах глабалізацыі сусветнай эканомікі адным з ключавых элементаў эканамічнай бяспекі становіцца знешнеэканамічная бяспека. Гэта асабліва актуальна для Рэспублікі Беларусь, паколькі яна мае адкрытую эканоміку, якая вельмі залежыць ад вынікаў знешнеэканамічнай дзейнасці, у тым ліку: як ад экспарту, так і ад імпарту тавараў.

Знешнеэканамічная бяспека, павінна вызначаць дынаміку ўнутрыэканамічных працэсаў, у сувязі з чым яна патрабуе выканання наступных асноўных умоваў [1]:

– удзел краіны ў сусветных гаспадарчых сувязях павінен ствараць спрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнай вытворчасці;

– нацыянальная эканоміка ў найменшай ступені павінна адчуваць неспрыяльнае развіцце падзеяў у свеце як у эканамічнай, так і ў палітычнай сферы, хоць цалкам пазбегнуць гэтага ўплыву ва ўмовах адкрытай эканомікі немагчыма.

Паколькі нацыянальная бяспека дзяржавы мае на мэце дасягненне высокага сацыяльнага ўзроўню, а эканамічная бяспека, ў сваю чаргу – садзейнічанне патэнцыялу высокага эканамічнага росту, то гэта дае падставы разглядаць знешнеэканамічную бяспеку як важкі складнік забеспячэння эканамічнага росту нацыянальнай эканомікі і яе высокага сацыяльнага ўзроўню.

У сувязі з тым, што знешнеэканамічная бяспека разглядаецца ў якасці структурнага кампанента эканамічнай бяспекі, яе змест звязаны з такімі

эканамічнымі аспектамі як ажыццяўленне шматвектарных гандлевых зносінаў, нарошчванне экспартных паставак, павышэнне долі высокатэхналагічнай прадукцыі ў экспарце, удасканаленне мытна-тарыфнага рэгулявання і выкарыстанне нетарыфных метадаў для абароны і падтрымкі айчынных вытворцаў, павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі і дзяржавы ў цэлым на знешніх рынках.

Знешнеэканамічная бяспека – гэта стан абароненасці дзяржавы і ейнай эканомікі ад небяспекі і пагроз, звязаных з ажыццяўленнем знешнеэканамічнай дзейнасці.

Як і ва ўсіх іншых галінах нацыянальнай бяспекі, у знешнеэканамічнай галіне таксама можна вылучыць небяспекі і пагрозы, якія зыходзяць з унутраных і знешніх крыніцаў.

Да унутраных крыніцаў небяспек і пагроз у знешнеэканамічнай сферы можна аднесці наступнае:

– недасканаласць прававой базы рэгулявання знешнеэканамічных адносінаў і недастатковая яе эфектыўнасць;

– структурная і галіновая дэфармаванасць эканомікі, перавага матэрыяла- і энергаемістых вытворчасцяў, недастатковае развіцце сферы паслуг, невысокая ўдзельная вага высокатэхналагічнай навукаемістай прадукцыі і павольнае абнаўленне прадукцыі;

– адставанне выведкі запасаў карысных выкапняў ад маштабаў іх здабычы, нізкі ўзровень самазабеспячэння сыравіннымі і, асабліва, энергетычнымі рэсурсамі;

– нізкая канкурэнтная здольнасць айчыннай прадукцыі;

– нізкая таварная і геаграфічная дыверсіфікацыя экспарта і імпарта.

Знешнія небяспекі і пагрозы ў знешнеэканамічнай сферы адзначаюцца тым, што з цяжкасцю паддаюцца кіраванню і часцей маюць некіраваны характар. Да іх крыніцаў можна аднесці наступнае:

– высокая залежнасць Рэспублікі Беларусь ад імпарту мінеральна-сыравінных рэсурсаў, многіх відаў прадукцыі, у тым ліку стратэгічнага прызначэння, а таксама камплектуючых вырабаў, і, як следства – высокая імпартаемістасць экспарту;

– страта значнай часткі традыцыйных рынкаў збыту ваенна-тэхнічнай і машынабудаўнічай прадукцыі;

– дыскрымінацыйныя меры з боку замежных краінаў або іх супольнасцяў у знешнеэканамічных адносінах з Рэспублікай Беларусь, што асабліва моцна адчуваецца на сусветных рынках прамысловага экспарту, трансферу тэхналогій і «ноу-хау»;

– выцясненне айчынных вытворцаў тавараў і паслуг (асабліва спажывецкіх тавараў) са знешніх і нават з унутранага рынку замежнымі канкурэнтамі;

– значная знешняя валавая пазыка і звязанае з гэтым павелічэнне расходаў бюджэту на яе пагашэнне, а таксама ўзмацненне спробаў

выкарыстоўваць яе ў якасці ціску пры прыняцці найважнейшых эканамічных і палітычных рашэнняў;

– абмежаванне доступу беларускіх даследчыкаў і суб’ектаў гаспадарання да найноўшых тэхналогій, вынікаў даследаванняў і распрацовак сусветнага ўзроўню;

– мэтанакіраваная палітыка замежных дзяржаваў і кампаній, якая стымулюе эміграцыю высокакваліфікаваных навукоўцаў і спецыялістаў з Рэспублікі Беларусь у іншыя краіны.

У цэлым, нягледзячы на тое, што для зручнасці аналізу знешнеэканамічная бяспека, разглядаецца як адзін са структурных элементаў эканамічнай бяспекі, якая, у сваю чаргу, з’яўляецца складовай часткай нацыянальнай бяспекі, варта адзначыць, што ўсе элементы і ўзроўні бяспекі звязаны цесна і непарыўна. Пагрозы і небяспекі на ўзроўні дзяржавы вельмі рэдка маюць ізаляванае дзеянне, і звычайна закранаюць адначасова некалькі галінаў. Так, напрыклад, магчымыя перабоі з пастаўкамі з-за мяжы паліўна-энергетычных рэсурсаў – гэта не толькі пагроза энергетычнай, але, адначасова, і вытворчай, знешнеэканамічнай, інфраструктурнай, а таксама сацыяльнай, ваеннай, экалагічнай бяспецы, і, нацыянальнай бяспецы – у цэлым. У дадзеным выпадку гэта звязана з тым, што для Беларусі паліўна-энергетычныя рэсурсы – гэта рэсурсы крытычнага імпарту, без якіх не зможа функцыянаваць вытворчасць, транспарт, жыллева-камунальная гаспадарка, сістэма абароны, не зможа вырабляцца і адпраўляцца на экспарт прадукцыя. Гэтак, небяспека, якая ўзнікла ў знешнеэканамічнай сферы (роўна як і ў любой іншай), і не сустрэла своечасовага процідзеяння, у канчатковым выніку можа перарасці ў пагрозу зруйнавальнага характару для дзяржавы і нацыі. Такім чынам, мэтай забеспячэння знешнеэканамічнай бяспекі з’яўляецца стварэнне ўмоваў для эфектыўнага процідзеяння небяспекам і пагрозам, звязаным з удзелам дзяржавы ў розных відах светагаспадарчых сувязяў і ажыццяўленнем знешнеэканамічнай дзейнасці па розных эканамічных напрамках.

Асноўная сутнасць функцыянавання сістэмы знешнеэканамічнай бяспекі дзяржавы заключаецца ў супрацьдзеянні знешнім і ўнутраным небяспекам і пагрозам. Паколькі Рэспубліка Беларусь не з’яўляецца ў сусветным маштабе дзяржавай з моцнай эканомікай, здольнай аказаць уплыў на сусветныя эканамічныя працэсы, праводзіць экспансію на рынкі іншых дзяржаваў, уплываць на рашэнні, якія прымаюцца міжнароднымі эканамічнымі і фінансавымі арганізацыямі, задзейнічаць іншыя фактары, якія б абумовілі стварэнне залежнасці іншых дзяржаваў і іхніх эканомік ад волі Рэспублікі Беларусь, адзіным даступным сродкам для процідзеяння знешнім небяспекам і пагрозам з’яўляецца ейная знешняя палітыка, якая павінна грунтавацца на прынцыпах міралюбнасці і дыпламатычнасці, на пошуку эканамічна ўзаемавыгадных спосабаў узаемадзеяння. Што тычыцца ўнутраных пагроз знешнеэканамічнай бяспекі, то тут на першы план

барацьбы з імі выходзіць палітыка па павышэнні канкурэнта-здольнасці а таксама, па навукова-тэхналагічным і інавацыйным развіцці, паколькі нявырашаныя менавіта ў гэтай сферы праблемы ў першую чаргу перадвызначаюць месца дзяржавы на міжнароднай эканамічнай арэне, і ейныя далейшыя перспектывы ў галіне знешнеэканамічнай дзейнасці. Асноўныя прынцыпы, мэты і задачы Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне заканадаўча замацаваны ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь» ад 14 лістапада 2005 г. № 60-З [2].

Важнейшыя асаблівасці, якія вызначаюць знешнюю палітыку Рэспублікі Беларусь і яе эканамічны складнік вызначаюцца ейным геаграфічным становішчам і гістарычным развіццем. Так на тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў сыходзяцца і перакрыжоўваюцца найважнейшыя транспартныя шляхі паміж Еўропай і Азіяй, паўночным і паўдневым, усходнім і заходнім напрамкамі. Разбуральныя наступствы шматлікіх войнаў і канфліктаў, прывялі да разумення той адказнасці, на якой павінна будавацца знешняя палітыка Беларусі. Яе прынцыповай і непарушнай асновай, фундаментальным прынцыпам павінна з’яўляцца шматвектарнасць, якая прадугледжвае развіцце збалансаваных канструктыўных адносінаў з партнерамі ў розных рэгіенах свету [3].

Вядзенне знешнеэканамічнай дзейнасці па абмежаваным пераліку таварных пазіцый і на абмежаванай колькасці рынкаў збыту стварае каласальную пагрозу для эканомікі адкрытага тыпу, паколькі ўзнікае жорсткая яе залежнасць не толькі ад эканамічных, але і ад палітычных фактараў, якія тычацца альбо гэтых тавараў, альбо – узаемаадносін паміж краінамі. Не маючы іншых альтэрнатываў у выглядзе рынкаў іншых дзяржаваў і іншых перспектыўных тавараў, краіна непазбежна пагоршыць свае пазіцыі ў сферы знешнеэканамічнай дзейнасці, а ў горшым выпадку можа страціць рычагі самастойнага кіравання эканамічнымі працэсамі і частку эканамічнага суверэнітэту. Важным з’яўляецца тое, што таварная і геаграфічная дыверсіфікацыя – гэта асноўная умова не толькі для экспарту, але і для імпарту. У выпадку з экспартам такая дыверсіфікацыя будзе забяспечваць устойлівае атрыманне выручкі, паступленне валюты, ад якога залежыць папаўненне золатавалютных рэзерваў, забеспячэнне міжнародных разлікаў, арганізацыя бесперабойнай пастаўкі сыравіны і камплектуючых. У выпадку з імпартам таварная дыверсіфікацыя неабходная для таго, каб на рынак паступалі тавары-аналагі, навінкі, якія не вырабляюцца ў краіне і яшчэ не вядомыя айчыннаму спажыўцу і такім чынам спрыяюць росту ўзроўню і якасці спажывання, а геаграфічная дыверсіфікацыя імпарту будзе садзейнічаць развіццю здаровай канкурэнцыі замежных тавараў на ўнутраным рынку, усталяванню аптымальных цэн, з’яўленню аналагічных тавараў больш высокай якасці. Калі гаворка ідзе пра тавары крытычнага імпарту (тых тавараў, якія немагчыма вырабіць у дастатковай

колькасці ў краіне, і без якіх не зможа функцыянаваць прамысловая вытворчасць, інфраструктура дзяржавы, сацыяльная сфера), то ў гэтым выпадку геаграфічная дыверсіфікацыя – гэта ключавы фактар не толькі знешнеэканамічнай, але і ў цэлым – нацыянальнай бяспекі. Таму ў дадзеным выпадку геаграфічная дыверсіфікацыя імпартных паставак такіх тавараў – гэта абавязковая ўмова, якая павінна выконвацца незалежна ад рынкавай кан’юнктуры, выгадных коштаў, умоваў паставак, якія склаліся на нейкім адным рынку. Адмова ад набыцця тавараў толькі на гэтым рынку нават на такіх выгадных умовах, на карысць іх пакупкі на некалькіх розных рынках нават па больш высокай цане можа прывесці да павелічэння кошту імпарту, але такое павелічэнне варта разглядаць як плату за забеспячэнне знешнеэканамічнай і нацыянальнай бяспекі і, у канчатковым выніку – за захаванне суверэнітэту дзяржавы.

Таварная і геаграфічная дыверсіфікацыя знешнеэканамічнай дзейнасці з’яўляецца складанай задачай таму, што яна не можа быць вырашана ізалявана, у адрыве ад іншых стратэгічных задач эканамічнага развіцця. Важным фактарам з’яўляецца правядзенне якаснай інавацыйнай палітыкі і садзейнічанне навукова-тэхнічнаму развіццю, тэхнічнаму пераўзбраенню вытворчасці. Гэта тычыцца, у першую чаргу, сферы матэрыяльнай вытворчасці, у прыватнасці – прамысловасці. Нягледзячы на тое, што сенняшняя постіндустрыяльная эканоміка развітых краінаў – гэта эканоміка паслуг, менавіта развіцце прамысловасці вызначае развіцце ўсіх іншых галінаў, уключаючы сферу паслуг і задае высокі стандарт іхняй якасці. Таксама важна тое, што менавіта тэхнічныя навінкі і інавацыйная прадукцыя з’яўляецца найбольш перспектыўнай на сусветных таварных рынках. Геаграфічная дыверсіфікацыя залежыць ад праводзімай дзяржавай палітыкі ў дачыненні да краінаў блізкага і далекага замежжа, мерапрыемстваў па садзейнічанні сяброўству і добрасуседству паміж дзяржавамі, развіццем сеткі дыпламатычных установаў за мяжой.

Спіс выкарыстаных крыніцаў

1. Полоник, С. С. Теоретико-методологические основы обеспечения внешнеэкономической безопасности Республики Беларусь в условиях усиления международной конкуренции / С. С. Полоник, Э. В. Хоробрых, А. А. Литвинчук // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. D, Экон. и юрид. науки.– 2013. – № 5. – С. 7–16

2. Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь от 14 ноября 2005 г. № 60-З [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Рэжым доступу : https://pravo.by/document /?guid=3871&p0=H10500060. – Дата доступу: 27.11.2022.

3. Приоритетные направления внешней политики Республики Беларусь [Электронный ресурс] // Министерство иностранных дел Республики Беларусь. – Рэжым доступу : https://mfa.gov.by/foreign_policy/ aims/. – Дата доступу: 27.11.2022.

УДК 320.0

## КАТЕГОРИИ ПОЛИТОЛОГИИ В КУЛЬТУРНЫХ КОДАХ ЗАПАДНОЙ И РУССКОЙ ЦИВИЛИЗАЦИЙ

Семёнова Л. Н., БНТУ, Минск
E-mail: ludmila.semenova@bntu.by

*В контексте западной и русской цивилизаций многие фундаментальные политологические понятия, такие как политика, государство, власть имеют разные смыслы.*

*Ключевые слова: цивилизация, культурный код, политика, управление, власть.*

## CATEGORIES OF POLITICAL SCIENCE IN THE CULTURAL CODES OF WESTERN AND RUSSIAN CIVILIZATIONS

*In the context of Western and Russian civilizations, many fundamental political science concepts, such as politics, the state, and power, have different meanings.*

*Keywords: civilization, cultural code, politics, governance, power.*

Современный терминальный кризис мировой системы капитализма и глобализации, осуществляемой по сценариям ее центра, обнажил несостоятельность западной либеральной гуманитарной мысли, включая политическую. В пору восхождения капитализма она была его научным отражением, идеологическим сопровождением и инструментом культурного подчинения периферии. Но ни тогда, ни теперь эта мысль не могла адекватно объяснить реальную сущность Запада и тем более других цивилизаций. Особенно это касается вопросов политической организации и управления. Решая идеологические задачи сокрытия глубин реального многослойного мирового политического и управленческого процесса, либеральная политология описывала лишь внешний публичный контур политической организации западных стран, видимые глянцевые витрины парламентаризма, гражданского общества, правового государства, демократии. При этом уникальный опыт западной цивилизации преподносился в качестве универсальных ценностей и усиленно насаждался по всему миру, как в известном выражении: «Если у вас нет демократии, тогда мы летим к вам». Между тем каждая цивилизация в рамках своих культурных кодов, идей-